ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
27
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 20 (1358)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ У МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

## АГІТПУНКТ ДЗЕЙНІЧАЕ

У ІНТЭРНАЦЕ № 2, што па вуліцы Кастрычніцкай, 20 чэрвеня тысячы студэнтаў універсітэта аддадуць свае галасы за кандыдатаў у дэпутаты ў мясцовыя Саветы народных дэпутатаў. Тут знаходзіцца выбарчы ўчастак. А на трэцім паверсе размясціўся агітпункт. З кожным днём тут становіцца ўсё больш ажыўлена. Усе наведвальнікі атрымліваюць вычарпальныя адказы.

...На століках раскладзена літаратура. Тут можна знайсці матэрыялы XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда Кампартыі Беларусі, пастанову ЦК КПСС і Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб выбарах у мясцовыя Саветы СССР», кнігі, якія расказваюць аб рабоце Саветаў. Побач — свежыя нумары газет і часопісаў, з якіх можна даведацца аб важнейшых навінах жыцця краіны.

Дзяжурны агітатар Анастасія Яўменаўна Брусевіч знаёміць з работай агітпункта, асноўны напрамак якога — правядзенне гутарак з выбаршчыкамі. Змястоўнасцю вызначаліся гутаркі «Канстытуцыя СССР — самая дэмакратычная ў свеце», «XXVI з'езд КПСС — з'езд будаўнікоў камунізму», «Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Саветы народных дэпутатаў», «Народны суддзя». Іх праводзяць агітатары універсітэта і прадпрыемстваў. На агітпункце працуе звыш 40 агітатараў.

**У. АБРАМОВІЧ.**



**Напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы народных дэпутатаў падоўгу гарыць святло ў пакоі 302 інтэрната № 2, што на Кастрычніцкай вуліцы. Тут размясціўся агітпункт. Выдатна афармленыя стэнды, спецыяльна падабраная літаратура знаёмяць выбаршчыкаў з дасягненнямі нашай краіны, з кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў.**

**НА ЗДЫМКУ: упершыню прыйдуць на выбарчы ўчастак першакурсніцы фізфака Наташа Смаляр і Тамара Івашка. Гутарку з імі вядзе агітатар, старшы інжынер упраўлення галоўнага механіка і энергетыка Мінлеспрома БССР Леанід Міхайлавіч Шарык.**

**Фота В. ШАЧАКА.**

«Беларускі універсітэт» ТЭЛЕТАЙП · Учора · Сёння · Заўтра ·

### АБ ВЫНІКАХ

XVII з'езда прафсаюзаў СССР і задачах студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі ў святле рашэнняў прафсаюзнага з'езда ішла прынцыповая размова ў час чарговай вучобы прафсаюзнага актыву універсітэта. Сваімі ўражаннямі аб рабоце з'езда прафсаюзаў СССР і XV з'езда прафсаюзаў БССР падзяліліся іх дэлегаты — старшыня мясцкома універсітэта Э. В. Шастаковіч і старшыня прафбюро геафака Т. Бялясава.

**Р. МАРЧУК,**
**старшыня прэс-цэнтра прафкома.**

### СУПРАЦОЎНІКІ АБАНЕМЕНТА

вучэбнай літаратуры універсітэцкай бібліятэкі арганізавалі агляд-выстаўку падручнікаў па фізіцы з мэтай далейшага паляпшэння забеспячэння вучэбнага працэсу. Рэкамендацыі і ўказанні па прымяненню кожнай з прадстаўленых кніг далі дэкан фізічнага факультэта Э. М. Шпілеўскі, загадчык кафедры агульнай фізікі прафесар А. М. Саржэўскі, намеснік дэкана фізічнага факультэта па вучэбнай рабоце А. А. Чупрыгін і іншыя выкладчыкі, якія наведалі выстаўку.

**І. ВАЛАСЕВІЧ,**
**супрацоўніца бібліятэкі.**

### ВА ЎСІХ ГРУПАХ

кафедры матэматычнага забеспячэння ЭВМ факультэта прыкладной матэматыкі прайшлі Ленінскія ўрокі, прысвечаныя XIX з'езду ВЛКСМ.

**В. ІЎЧЫК,**
**сакратар камсамольскага бюро кафедры.**

### ФАКУЛЬТЭЦКАЯ СПАРТАКІЯДА

СБА, якая адбылася на механіка-матэматычным факультэце, складалася са спаборніцтваў па валейболу, плаванню, лёгкай атлетыцы. Сярод 15 факультэцкіх атрадаў, якія прымалі ўдзел у спартакіядзе, пераможцамі вызначаны СБА «Расінка» і «Сябры».

**А. ТАРАСЕВІЧ,**
**член камітэта камсамола мехмата.**

● ПА СТАРОНКАХ КНІГ

## АБ ГЕРАІЗМЕ І МУЖНАСЦІ

РЫХТУЮЧЫСЯ да сустрэчы 60-годдзя ўтварэння СССР, работнікі аддзела абслугоўвання бібліятэкі сумесна з грамадскімі арганізацыямі факультэтаў праводзяць плённую работу па героіка-патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

Цікавыя канферэнцыі чытачоў па кнігах Л. І. Брэжнева «Малая зямля», «Успаміны» былі арганізаваны на механіка-матэматычным, геаграфічным, філалагічным факультэтах. Акрамя таго, праведзены дыспуты па кнігах К. Сіманава «Дні і ночы», А. Бека «Валакаламская шаша», І. Вяргасава «Застанецца з табой назаўсёды», В. Курачкіна «На вайне як на вайне», Ч. Айтматава «І даўжэй веку цягнецца дзень».

Са змястоўнымі дакладамі на іх выступілі студэнты мехмата А. Вілько, І. Пракаповіч. Творча падышлі да сваіх выступленняў студэнты-фізікі І. Дзюба, Я. Макараў. Яны расказалі аб гераізме і мужнасці савецкіх людзей у тыле і на перадавой.

Успамінамі аб перажытым падзяліліся ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны Герой Савецкага Саюза І. С. Жыгараў, старшыня савета ветэранаў вайны універсітэта І. В. Марчанка, ветэраны 18-й арміі Т. А. Абрашкін, Т. Г. Уласаў, М. І. Аносаў.

**І. БАРДЗІЯН,**
**супрацоўніца бібліятэкі.**

● ДА 60-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ СССР

## З песняй да сяброў

НЕ ШМАТ ЧАСУ, здаецца, прайшло пасля зімовых канікулаў, калі сталіцу Беларусі наведалі ўдзельнікі народнага ансамбля песні і танца Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Івана Франко «Чарамош». І вось ужо ў плане творчага абмену паміж калектывамі мастацкай самадзейнасці ў госці да сяброў сабраліся члены народнай харавой капэлы нашага універсітэта.

Шчырымі поціскамі рук, усмешкамі, кветкамі сустракалі беларускую дэлегацыю прадстаўнікі парткома, прафкома і студэнцкага клуба Львоўскага універсітэта. Размясцілі гасцей у студэнцкім інтэрнаце.

Старажытны горад раскрыў перад беларускімі студэнтамі скарбніцы музеяў, таямніцы легендарных мясцін, самабытнасць архітэктурных помнікаў.

Назаўтра нас чакаў прыём у рэктараце Львоўскага універсітэта, затым — экскурсія па факультэтах, лабараторыях, універсітэцкаму музею. На канцэрце нашай харавой капэлы прысутнічалі студэнты і супрацоўнікі універсітэта, удзельнікі сустрэчы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівы поспех выпаў на долю лаўрэата фестываляў палітычнай і самадзейнай песні студэнта філфака А. Аціьмана, які выступіў разам з капэлай.

Украінскія сябры арганізавалі для нас цікавую экскурсію па гістарычных мясцінах горада і азнаямленчую паездку за 100 км ад Львова, дзе знаходзіцца старажытны помнік архітэктуры — Алескі замак, у якім размешчаны зараз філіял Львоўскай карціннай галерэі. У двары замка, карыстаючыся выдатнай акустыкай, самадзейныя артысты арганізавалі імправізаваны канцэрт. Затым мы наведалі Падгарэцкі замак, дзе здымаўся мастацкі фільм паводле аповесці беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха».

Па дарозе назад спыніліся ля помніка-манумента байцам першай коннай арміі Будзённага.

Паездка вельмі аб'яднала калектыў народнай капэлы. Дзякуючы пастаянным зносінам на працягу некалькіх дзён студэнты розных факультэтаў яшчэ больш пасябравалі. Таму доўга будуць памятаць цікавую паездку навічкі калектыву Наташа Судлянкова з хімфака, Саша Якімушкін і Валодзя Сідаровіч з факультэта радыёфізікі і электронікі, Зіна Елатава з мехмата, Жанна Хворык з ФПМ, а таксама ветэраны харавой капэлы Іван Іванавіч Жылінскі, супрацоўнік біяфака, трэцякурсніцы філалагічнага факультэта Лілія Шаўцова і Вольга Сталбова, будучы гісторык Лена Панамарова і многія іншыя.

**Л. БАРАНОЎСКАЯ,**
**інструктар студэнцкага клуба.**



— Увага! Пачынаем! — і Ядзвіга Адамаўна Малішэўская, старшы выкладчык кафедры нямецкай мовы, уключае магнітафоны. Тут, у лінгафонным кабінеце, ідуць заняткі ў першакурснікаў дзесятай групы фізфака. Юнакі і дзяўчаты моўчкі слухаюць тэксты, пытанні. У класе — цішыня. Кабіны ізаляваны адна ад адной, а пульт дапамагае кіраваць заняткамі, апытваць кожнага студэнта паасобку, даваць яму парады, заданні.

**НА ЗДЫМКАХ:** першакурснікі фізфака ў лінгафонным кабінеце; за пультам — Ядзвіга Адамаўна Малішэўская (злева) і дацэнт Алена Піліпаўна Калевіч.

Фота В. ШАЧАКА.




**Бурнае развіццё навукі і тэхнікі вызначае сённяшні дзень. Розныя машыны, механізмы, ЭВМ грунтоўна ўвайшлі ў наша жыццё. Рашучае наступленне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі не абышло і студэнтаў. З кожным годам мы атрымліваем усё больш удасканаленыя сродкі для вучобы. Яны дапамагаюць больш эфектыўна ўспрымаць новую інфармацыю, глыбей пазнаваць сутнасць тых ці іншых з'яў, дазваляюць рацыянальна выкарыстоўваць свой час.**

**Сённяшняя гаворка пойдзе пра выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання (ТСН). Наш карэспандэнт пабываў на ФПМ і фізічным факультэце.**

● ДАВАЙЦЕ АБМЯРКУЕМ

# Ёсць прапанова!

У АПОШНІ час у друку часта можна сустрэць абрэвіятуру НАРП. Гэта — навуковая арганізацыя разумовай працы. Культуры разумовай працы заўсёды ўдзялялася вялікая ўвага, але ў апошні час, у сувязі з НТР, у сувязі са значным расшырэннем галіны пазнання і з узросшым патокам інфармацыі, пытанне авалодання навыкамі НАРП стала асабліва актуальным.

Перад вышэйшай школай стаіць задача не толькі даць студэнту веды, але і навучыць яго здабываць гэтыя веды самастойна. Сучасны студэнт вырашае праблему пошуку і выбару шляхоў найбольш якаснага авалодання інфармацыяй. У гэтым яму заклікана дапамагчы НАРП, сістэма методык, такіх, як заняткі аўтатрэнінгам, авалоданне скарапісам і навыкамі хуткага чытання, трэніроўкі памяці, выкананне патрабаванняў гігіены, рэжым працы.

Дзе і як можна навучыцца рацыянальнай арганізацыі сваёй працы?

У нас ва універсітэце на працягу шэрагу гадоў працуе гурток хуткага чытання. Вядзе яго Сталіна Пятроўна Цуранава, выкладчыца кафедры псіхалогіі.

Калі мы толькі пачыналі наведваць гурток, хуткасць нашага чытання складала 900—1200 знакаў у мінуту, а ўжо пасля 2-х месяцаў навучання яна ўзрасла да 1900—2500 знакаў — у сярэднім у 2,5 раза. Акрамя гэтага, успрыманне прачытанага матэрыялу, як падлічылі, з 60—75 працэнтаў павялічылася да 85—90. Навык хуткага чытання дазваляе студэнту на больш высокім узроўні працаваць з кнігай. Ён вучыцца не толькі хуткаму чытанню, але і якаснаму засваенню прачытанага. Вучыцца ўменню бачыць у тэксце асноўныя палажэнні і думкі, выбіраць інфармацыю, неабходную для работы.

Кожнаму зразумела, што сістэма, якая патрабуе адпаведнай кваліфікацыі, адпаведнага ўзроўню падрыхтоўкі, не можа распаўсюдзіцца сярод студэнтаў сама па сабе. Мне здаецца, што ў арганізацыйнай структуры універсітэта ёсць такія грамадскія арганізацыі, якія маглі б узяць на сябе ролю распаўсюджвальніка. Напрыклад, ФГП, на базе якога можна было б рыхтаваць інструктараў з ліку саміх студэнтаў. Можна было б увесці курс НАРП у форме факультатыўных заняткаў на кожным факультэце. Вялікую карысць прынеслі б гурткі НАРП, створаныя на кафедрах.

Вопыт такой работы ёсць. Напрыклад, у Ленінградскім інстытуце сталі і сплаваў на першым годзе навучання студэнтам у якасці факультатыва чытаецца курс лекцый па НАРП, прапаноўваецца шэраг методык і рэкамендацый, якія дазваляюць ім з першых жа дзён вучобы падысці да праблемы набыцця ведаў на больш высокім узроўні.

І ў нас ва універсітэце ёсць шмат людзей з ліку студэнтаў і выкладчыкаў, якія жадаюць бліжэй пазнаёміцца і прыняць у стварэнні універсітэцкай сістэмы НАРП непасрэдны ўдзел.

**С. ПЛЯЧКОЎ,**
**студэнт III курса ФПМ.**

# У пошуку аптымальнага выкарыстання

**● РЭЙД РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»: ТСН У ВУЧЭБНЫМ ПРАЦЭСЕ**

Тэхнічныя сродкі навучання на факультэце прыкладной матэматыкі базіруюцца ў асноўным на электронна-вылічальнай тэхніцы. Да яе адносяцца, па-першае, ЭВМ, па-другое, — дысплеі. ЭВМ, электронна-вылічальныя машыны, напэўна, цяпер ужо ўсім больш ці менш знаёмая тэхніка. А вось дысплеі, ці тэрміналы, — гэта ўжо прынцыпова новыя прыстасаванні. Яны служаць для адлюстравання алфавітна-лічбавай інфармацыі.

Гаворыць А. В. Самусенка, намеснік дэкана факультэта:

— Ужо з першага курса ўсе нашы студэнты праходзяць навучанне па курсу ЭВМ і праграміраванню. Потым — пасля першага і другога курсаў — двухтыднёвая практыка. З III курса пачынаецца спецыялізацыя.

На факультэце ёсць чатыры дысплеі. Для вучэбнага працэсу гэта яшчэ недастаткова. Таму ў гэтым годзе плануецца закупіць яшчэ восем тэрміналаў.

Мне давялося пабываць у класе дысплеяў, наглядаць за работай студэнтаў. Дысплеі падобны на невялічкія тэлевізары з клавіятурай. Ціснеш на клавішу — і на экране паяўляюцца маленькія зялёныя літары, лічбы, знакі. Зразумела, каб выканаць самае элементарнае заданне на дысплеі, неабходны пэўныя спецыяльныя веды.

Гутару з інжынерам-электрыкам класа дысплеяў А. У. Храпічам.

— Перш чым студэнт сядзе за дысплей, ён вучыцца мове праграміравання, потым — дыялогаваму ўводу заданняў. Толькі тады студэнт можа працаваць з тэрміналам.

— Анатоль Уладзіміравіч, але ж неяк абыходзіліся і без тэрміналаў. У чым эфектыўнасць іх выкарыстання?

— Так, абыходзіліся і без тэрміналаў. Але перфакарткі займалі шмат часу, значна больш, чым праца на тэрміналах. Каб выправіць тую ці іншую памылку, іншы раз прыходзілася звяртацца ў ВЦ некалькі разоў. Бывала, у канцы семестра машыны ў вылічальным цэнтры так загружаны, што студэнт меў магчымасць звярнуцца да іх усяго адзін-два разы ў тыдзень, не часцей. Уяўляеце, колькі часу даводзілася затрачваць на выкананне аднаго ці некалькіх заданняў або курсавой работы?

Цяпер студэнт ужо сам набірае на клавіятуры патрэбную яму інфармацыю і з экрана адпраўляе на ЭВМ. Ён ужо бачыць, што набірае, колькасць памылак значна памяншаецца або і зусім зводзіцца да нуля. Студэнт намнога хутчэй выконвае сваё заданне.

Нас хутка перастаюць задавальняць тыя дасягненні, якія яшчэ ўчора лічыліся апошнім словам навукі і тэхнікі. Лінгафонныя кабінеты, праекцыйныя апараты, тэлебачанне — такія рэчы, бадай што, ёсць на кожным факультэце. Гэтыя ТСН ужо даўно ўспрымаюцца намі як звычайная з'ява.

— Самыя сучасныя тэхнічныя сродкі навучання? — перапытвае загадчык кафедры агульнай фізікі, старшыня метадычнай камісіі А. М. Саржэўскі. — Увогуле на фізфаку я б вылучыў два з іх: лекцыйныя дэманстрацыі і фізічны практыкум. Вось у гэтых напрамках і вядзецца ўдасканаленне тэхнічных сродкаў навучання. Думаю, цікава было б пагутарыць з В. М. Навумчыкам, загадчыкам лабараторыі лекцыйнага эксперыменту. А потым прайсці па іншых нашых лабараторыях, кафедрах— яны самыя красамоўныя «расказчыкі».

Звяртаюся да В. М. Навумчыка:

— Віктар Мікалаевіч, скажыце, калі ласка, чым займаецца лабараторыя лекцыйнага эксперыменту, як яна дапамагае студэнтам?

— Наша лабараторыя першая — з 1973 года — пачала самастойна ствараць тэхнічныя сродкі навучання. Так што калі ўлічыць, што сродкі лекцыйнай дэманстрацыі нікім, акрамя нас, не распрацоўваюцца — мы наогул займаемся піянерскай справай, і значна шырэй— навуковай работай па распрацоўцы тэхнічных сродкаў навучання і эфектыўнасці іх выкарыстання. Адначасова імкнёмся знайсці шляхі аптымальнага ўжывання сродкаў. Напрыклад, праводзім розныя анкеты сярод студэнтаў з пытаннямі аб эфектыўнасці і максімальнасці выкарыстання той ці іншай дэманстрацыі.

Дзякуючы старшаму выкладчыку кафедры агульнай фізікі А. П. Клішчанка і загадчыку вучэбных лабараторый механікі і малекулярнай фізікі І. А. Дудараву я змагла пабываць у розных лабараторыях факультэта.

Лабараторыя электрычнасці. Усяго на факультэце іх тры.

— Тэхнічныя сродкі навучання тут, — расказвае А. П. Клішчанка, — раздзяляюцца на два напрамкі. Першы дае магчымасць непасрэдна вывучаць фізічны працэс, які адбываецца ў схемах. Другі напрамак— прыкладнога характару. Ён прывівае навыкі студэнтам да зборкі схем і, што важна, дазваляе займацца творчым пошукам.

— Лабараторыя оптыкі, — паведамляе Анатоль Пятровіч. —Спецыфіка работы студэнтаў у гэтай лабараторыі заключаецца ў індывідуальным метадзе выканання лабараторнай работы. Кожны павінен сваімі вачыма ўбачыць у мікраскопе чакаемы вынік, вылічыць нешта адносна яго на вымяральнай прыладзе, зрабіць адлік.

З некаторага часу большую ўвагу пачалі ўдзяляць вывучэнню з'яў спектральнага вылічэння, што дазваляе больш дакладна пазнаваць тую ці іншую з'яву.

**А. ЛЫСЮК.**

● РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

# РАВЕСНІК ВЕКА

ЧАСТА даводзіцца чуць аб кім-небудзь: «равеснік века». І мы настолькі прывыклі да гэтай фразы, што часам нават не задумваемся аб яе сэнсе. Бо равеснік века — гэта чалавек, які ідзе ў нагу з часам, заўсёды знаходзіцца на перадавых пазіцыях, пастаянна ў руху, у пошуку. Ён ніколі не спыняецца на дасягнутым, імкнецца наперад.

Іменна гэтыя якасці і ўласцівы Ананію Цімафеевічу Шышкіну. І справа не толькі ў тым, што Ананій Цімафеевіч нарадзіўся ў 1900 годзе, які паклаў пачатак нашаму імкліваму веку, а ў тым, што ўсё сваё жыццё ён застаецца равеснікам тых, хто робіць гісторыю. Як сказаў аб ім старшыня партыйнай арганізацыі гаспадарчай часткі Белдзяржуніверсітэта Сяргей Максімавіч Касячэнка—«гэта цудоўны чалавек з чулай душой і добрым сэрцам».

Нялёгкім было дзяцінства Ананія Цімафеевіча. Нарадзіўся ён у невялікай забайкальскай вёсачцы. Як і ўсе дзеці беднякоў, з малых гадоў дапамагаў бацьку па гаспадарцы. Ён умеў цаніць кожны кавалак хлеба, якога не еў удосталь нават па рэдкіх святах.

Калі ў Забайкалле прыйшла Савецкая ўлада, Ананій Цімафеевіч стаў агітаваць народ уступаць у калгасы, змагаўся з кулакамі, заўсёды быў там, дзе цяжэй. У 1926 годзе ў яго жыцці адбылася важная падзея—ён уступіў у рады камуністаў.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён будаваў дамбы ў Забайкаллі. Працаваць даводзілася ў складаных умовах. Ананій Цімафеевіч не любіць гаварыць пра свае заслугі. Аб баявым і працоўным гераізме гэтага чалавека красамоўна гавораць яго шматлікія ўзнагароды.

З 1960 года ён працуе на пасадзе старшага інжынера аддзела забеспячэння БДУ імя У. І. Леніна. За гэты час былі пабудаваны 7 вучэбных карпусоў, 6 студэнцкіх інтэрнатаў, 2 жылыя дамы, 7 студэнцкіх сталовых. І ўсё гэта не без актыўнага ўдзелу Ананія Цімафеевіча. Ён прапаноўваў, спрачаўся, адстойваў сваю думку аб паляпшэнні планіроўкі пабудоў. І з ім згаджаліся. Інакш нельга было, таму што гэты чалавек душой хварэў за сваю справу, не мог заставацца ў баку, калі бачыў дзе-небудзь непарадак.

У апошнія гады работы ў БДУ ён быў членам партыйнага бюро адміністрацыйна-гаспадарчай часткі.

У Ганаровай грамаце рэктарата БДУ чытаем такія словы: «Мы высока цэнім Вашы асабістыя якасці: сумленнасць, прынцыповасць, высокую патрабавальнасць, чуласць і дабрату, гатоўнасць у любую мінуту прыйсці на дапамогу таварышу, партыйнасць у рашэнні ўсіх службовых пытанняў».

У 1980 годзе Ананій Цімафеевіч пайшоў на заслужаны адпачынак. На апошнім партыйным сходзе А. Ц. Шышкіну быў уручаны Знак «50 год знаходжання ў КПСС». Для яго гэта—50 гадоў плённай дзейнасці на карысць свайго народа.

**І. АНІКЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

# АГЛЯД ЗАВЕРШАНЫ, РАБОТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ЗАВЯРШЫЎСЯ традыцыйны агляд-конкурс сродкаў насценнага друку «Камсамольскага пражэктара». Што ж паказаў чарговы агляд? Перш за ўсё, значна больш разнастайным стаў змест выпускаў «КП», расшырылася кола ўзнімаемых у іх праблем, палепшылася мастацкае афармленне, шырэй сталі ўжывацца новыя, арыгінальныя формы і прыёмы. Камітэт камсамола, штабы «Камсамольскага пражэктара» ўдзяляюць галоснасці рэзультатаў праверак вялікую ўвагу, бачаць у насценным друку надзейнага памочніка ў рэалізацыі сваіх прапаноў. На жаль, не прынялі ўдзел у аглядзе гістарычны, геаграфічны і фізічны факультэты. Па сутнасці, ігнараваў агляд-конкурс камітэт камсамола выкладчыкаў і супрацоўнікаў, хоць пад яго кіраўніцтвам знаходзяцца такія буйныя камсамольскія арганізацыі, як НДІ ПФП, НДІ ФХП, ВЦ, дзе для работы «Камсамольскага пражэктара» шырокі прастор.

Пры падвядзенні вынікаў агляду-конкурсу ўлічваліся змест, мастацкае афармленне, актуальнасць, крытычная накіраванасць матэрыялаў. Рашэнне журы было аднадушным — лепшым быў прызнаны выпуск «Камсамольскага пражэктара» юрыдычнага факультэта. Моцна дасталося ў ім студэнтам-двоечнікам, прагульшчыкам, аматарам мастацкага жывапісу на аўдыторных сталах.

Другое месца занялі «пражэктарысты» факультэта прыкладной матэматыкі. Галоўную ўвагу ў сваім нумары яны прысвяцілі праблемам арганізацыі работы факультэцкай ДНД, прадаставіўшы слова намесніку дэкана ФПМ Г. П. Размысловічу. Характэрна, што «Камсамольскі пражэктар» не абмяжоўваецца простай канстатацыяй фактаў, а дае сваё тлумачэнне, выносіць канкрэтныя прапановы па ўдасканаленню работы ДНД.

У ліку прызёраў аказаліся і будучыя біёлагі. Тэмай конкурснага выпуску яны абралі бягучую паспяховасць і вынікі рэйду па інтэрнаце № 8. Хочацца пажадаць ім больш востра ставіць пытанні, смялей рабіць прапановы.

А вось прадстаўнікоў механіка-матэматычнага факультэта падвяла ўласная недысцыплінаванасць. Штрафныя балы, налічаныя факультэту за нясвоечасовае прадстаўленне матэрыялаў на конкурс, якраз і не дазволілі мехматаўцам трапіць у прызёры. Яны на чацвёртым месцы.

Пятымі былі будучыя журналісты. Выбраўшы для конкурснага нумара тэму наведвання заняткаў, яны не змаглі як след аформіць сваю газету з мастацкага боку.

На наступных месцах аказаліся радыёфізічны, хімічны і філалагічны факультэты.

Вынікі агляду падведзены на пасяджэнні штаба «КП» БДУ імя У. І. Леніна, лепшыя факультэцкія штабы былі ўзнагароджаны граматамі камітэта камсамола універсітэта. У прадстаячай рабоце «пражэктарыстам» неабходна замацаваць дадатныя і выправіць негатыўныя моманты ў сваёй дзейнасці, якія былі адзначаны ў час агляду-конкурсу.

**А. ШЫБУТ,**
**старшыня штаба «КП» БДУ імя У. І. Леніна.**

**КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР**

# ПАТРАБУЕ РАШЭННЯ

ДА ГЭТАГА ПЫТАННЯ цяжка падысці без эмоцый. Пэўна, колькі існуе студэнцтва, столькі ж ідзе барацьба за наведванне. У чым жа прычына пропускаў заняткаў студэнтамі нашага, радыёфізічнага факультэта?

Паленаваўся ўстаць — першую пару праспаў; не падрыхтаваўся да семінара — рашыў не ісці на яго; ездзіў дамоў — не купіў своечасова білет назад; не паснедаў — пайшоў абедаць у час лекцыі. Гэты пералік можна прадоўжыць. Няма ніякіх апраўданняў такім пропускам! Яны з'яўляюцца праяўленнем толькі асабістай неарганізаванасці і абыякавасці і павінны строга карацца. Павінны, але дзейсных мер прымаецца вельмі мала. І вучэбна-выхаваўчая камісія, і дэканат, і пярвічныя камсамольскія арганізацыі могуць аб'явіць вымову, зняць стыпендыю, паслаць пісьмо бацькам, нават хадайнічаць аб выключэнні з універсітэта. Могуць, але чамусьці амаль не выкарыстоўваюць гэтых магчымасцей. А вось пасля кожнай сесіі рэгулярна выключаюцца з ліку студэнтаў юнакі і дзяўчаты, якія да гэтага часу фактычна самі сябе выключылі, атрымаўшы 2—3 двойкі. А дзе ж былі і ВВК, і дэканат, і камітэт камсамола тады, калі гэты студэнт рабіў першыя крокі да выключэння, не наведваючы заняткі?

На жаль, вельмі малое маральнае ўздзеянне на прагульшчыкаў з боку камсамольскіх арганізацый. Нярэдка самі камсамольскія актывісты дапускаюць неабгрунтаваныя пропускі. Наведванне, а праз яго і паспяховасць, павінны стаць, на наш погляд, галоўным крытэрыем ацэнкі работы камсамольскай арганізацыі. Толькі гэта можа ўмацаваць барацьбу з прагуламі. Наведванне заняткаў павінна стаць вызначальным пытаннем і на атэстацыі па грамадска-палітычнай практыцы.

Ёсць і яшчэ прычыны, якія ўплываюць на наведванне. Сумбурнае, незразумелае выкладанне альбо непатрэбнае разжоўванне даўно вядомага, што, на жаль, часам яшчэ сустракаецца, прымушаюць студэнта вырашыць, што вывучаць такую дысцыпліну ён будзе па падручніках. Вось і атрымліваецца, што ў лепшым выпадку студэнт проста адседжвае на лекцыі, а ў горшым — прапускае такія лекцыі.

Праблему наведвання можна вырашыць, калі ўзяцца за яе сур'ёзна, камбінуючы меры пакарання з перакананнем.

**А. ПАЛЕЙКА, Т. ЯНАЧКІНА,**
**студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі.**

**КАМЕНТАРЫЙ ЛІХТАРЫКА:**

**Заўвагі і прапановы, выказваемыя аўтарамі, не бясспрэчныя. Ліхтарык просіць прыняць удзел у размове прадстаўнікоў дэканатаў, ВВК, іншых грамадскіх арганізацый, падзяліцца вопытам работы ў гэтым напрамку.**

**● ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Г. ДЗІМІТРАВА**

# НАТХНІЦЕЛЬ ДРУЖБЫ

НАТХНІЦЕЛЕМ дружбы і супрацоўніцтва сацыялістычнай Балгарыі з Савецкім Саюзам быў верны сын Балгарыі, вядомы дзеяч міжнароднага рабочага і камуністычнага руху, вялікі сябар Савецкага Саюза Георгій Дзімітраў.

Савецкі Саюз забяспечыў нацыянальную незалежнасць Балгарыі, дазволіў балгарскаму народу самому вызначыць далейшы лёс сваёй Радзімы.

Супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам азначала хуткае пераадоленне разрухі, эканамічную незалежнасць і прагрэс. Дружба з Савецкім Саюзам забяспечыла балгарскаму народу неабходныя ўмовы для ўмацавання народна-дэмакратычнай улады і для перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі.

Іменна таму Дзімітраў, а разам з ім і ўвесь балгарскі народ заяўляе: «Для балгарскага народа дружба з Савецкім Саюзам так жа жыццёва неабходна, як сонца і паветра для ўсякай жывой істоты».

Георгій Дзімітраў распрацаваў асноўныя напрамкі развіцця краін народнай дэмакратыі. І адной з асноўных рыс, якія характарызуюць гэта развіццё, ён лічыў дружбу і супрацоўніцтва з краінай перамогшага сацыялізму. Гэта важнейшая асаблівасць адлюстравана ў асноўных дакументах, якія вызначылі развіццё НРБ.

Жыццё пацвердзіла правільнасць запаветаў Дзімітрава. Зараз НРБ з'яўляецца адным з буйнейшых партнёраў СССР у галіне гандлю. Разам з эканамічнай магутнасцю вырас і палітычны аўтарытэт нашай краіны.

**РУМЯН СЕЧКАЎ,**
**аспірант кафедры гісторыі СССР.**

**● ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ**

# КЛОПАТЫ ПРАФБЮРО

Восем гадзін раніцы. Паволі абуджаецца інтэрнат, што знаходзіцца на вуліцы Курчатава. У вокны заглядвае майскае сонейка, побач радасна шуміць гай.

Восем сорак пяць. Застукалі па лесвіцах абцасы. Ліфт ледзь паспявае ездзіць уверх, а потым уніз, уверх-уніз... Адным словам, час «пік». Спяшаюцца на заняткі ў вучэбны корпус радыёфізікі. Лекцыі, семінары, лабараторныя...

А на перапынку студэнты ўсіх курсаў збіраюцца ў холе другога паверха. Тут вывешваецца фотагазета аб справах у інтэрнаце. Ох, і сорамна становіцца тым, хто бачыць на здымках не вельмі прывабныя «інтэр'еры» сваіх пакояў.

Прафбюро нашага факультэта на чале са старшынёй Мікалаем Майсеевым, студсавет восьмага інтэрната пільна сочаць за парадкам у пакоях студэнтаў. І гэта дае добрыя вынікі. Рабяты імкнуцца лепш наладзіць свой быт. З густам афармляюць пакоі, робяць усё магчымае, каб у іх было і прыгожа, і зручна.

У тым, што студэнцкія пакоі знаходзяцца ў належным стане, вялікая заслуга жыллёва-бытавой камісіі студсавета. Яе ўзначальвае Сяргей Карповіч.

Трэба адзначыць, што ў інтэрнаце існуюць два студсаветы: радыёфізічнага і біялагічнага факультэтаў. Дзякуючы іх сумесным намаганням жыццё ў студэнтаў цікавае і разнастайнае. Ужо традыцыйнымі сталі спаборніцтвы па шахматах, шашках, баскетболу, валейболу, футболу. Вялікую цікавасць выклікаюць лекцыі на міжнародныя тэмы. Так, нядаўна выкладчыкі факультэта радыёфізікі і электронікі А. Ф. Шылаў і І. А. Кобак прачыталі лекцыю «Адукацыя ў ЗША».

Ёсць у радыёфізікаў і біёлагаў яшчэ адна агульная справа. Як вядома, на другім паверсе восьмага інтэрната хутка будзе адкрыты універсітэцкі прафілакторый. Зараз ідзе рамонт, вядзецца абсталяванне пакояў. Студэнты наладжваюць суботнікі, дапамагаюць хутчэй закончыць работы.

Шмат клопатаў у прафбюро нашага факультэта. Але любыя перашкоды можна пераадолець, калі за справу брацца дружна, разам. Іменна так робяць радыёфізікі.

**Г. ШАПЯЛЕВІЧ,**
**студэнтка І курса факультэта радыёфізікі і электронікі.**



**Цесныя творчыя сувязі існуюць паміж навуковымі супрацоўнікамі праблемнай лабараторыі меліярацыі ландшафтаў БДУ імя У. І. Леніна і Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. На працягу многіх гадоў яны сумесна выконваюць дагавор аб навуковым супрацоўніцтве па пытанню меліярацыйнай рэканструкцыі і фарміраванню культурных ландшафтаў у зоне Аршана-Магілёўскай лясной раўніны.**

**НА ЗДЫМКУ: ідзе абмеркаванне вынікаў даследавання на меліярацыйным аб'екце. Злева направа: прафесар БСГА Ф. К. Курапаценка, старшы навуковы супрацоўнік праблемнай лабараторыі меліярацыі ландшафтаў БДУ В. М. Яцухна, аспірант БСГА С. З. Масцераў, інжынер-картограф БДУ М. Н. Брылеўскі.**

**● З НАШАЙ ПОШТЫ**

# «НА ПЕРШЫМ КУРСЕ ТАКОГА НЕ БЫЛО...»

А ПАЛОВЕ дзевятай былі ўжо на месцы збору. Смех, жарты чуліся з усіх бакоў. З гэткай жа прыўзнятасцю і працавалі мы на суботніку па ачыстцы вуліц горада. Работа ішла добра, прыемна было глядзець, як працуе група — з энтузіязмам, з агеньчыкам. Сярод першых, як заўсёды, Соф'я Дабрук, Ала Дубіцкая, Васіль Вашчанчук, Надзея Волчык, Аня Бяліцкая, Таццяна Дудук, Паша Уласюк, Зоя Васілеўская.

І чамусьці падумалася: «На першым курсе такога не было». Не, суботнікі былі і вечары былі, і камсамольскія сходы былі, а такога запалу, такога сяброўства — не было. Ды гэта і зразумела: сабраліся людзі незнаёмыя, з рознымі характарамі, з рознымі захапленнямі. І сходы праходзілі «сухавата», і культурных мерапрыемстваў было не так многа, і сесіі здавалі не так, як хацелася б. Але час ішоў, назапашваўся вопыт, агульныя мерапрыемствы неяк аб'ядналі групу. Рэгулярна сталі праводзіцца палітінфармацыі, у якіх усе прымаюць актыўны ўдзел, часцей усёй групай пачалі наведваць тэатры і музеі, лепш пазналі сяброў.

Заўсёды з намі Ірына Феліксаўна Долбік — наш куратар, непасрэдны ўдзельнік усіх мерапрыемстваў, наш першы дарадчык. Іменна ёй у многім мы абавязаны стварэннем трывалага калектыву ў групе. Ірына Феліксаўна цікавіцца не толькі тым, як мы вучымся. Яна заўсёды знойдзе час спытаць у кожнага, як дома справы, ці няма якіх цяжкасцей.

Мы ўжо дарослыя людзі, самастойныя, але вельмі добра, калі побач ёсць яшчэ і старэйшы сябар, якім для нас з'яўляецца Ірына Феліксаўна.

**І. БЕГЛІК,**
**камсорг першай групы II курса філфака.**

**● КОНКУРС**

# ГУЧЫЦЬ ПАЛІТЫЧНАЯ ПЕСНЯ

У ЧАС АДКРЫЦЦЯ універсітэцкага конкурсу палітычнай песні да ўдзельнікаў і гледачоў звярнуліся з прывітаннем студэнты з замежных краін.

— Удзел у такім конкурсе— адна з форм пратэсту супраць вайны, — сцвярджалі Фелікс Фардэс Гарсэ з Кубы і Пір Мухамед з Афганістана.

Конкурс пачала агітбрыгада юрыдычнага факультэта. З літаратурна-музычнай кампазіцыяй выступіў ансамбль палітычнай песні факультэта радыёфізікі і электронікі. Асабліва масавым удзелам у конкурсе вызначыліся студэнты факультэта прыкладной матэматыкі.

Журы падвяло вынікі конкурсу, пераможцам у якім стаў квартэт юрыдычнага факультэта. На другім месцы — вакальная група ФПМ, на трэцім — дуэт з ФПМ у саставе У. Шымарова і Т. Філімонавай. Першае месца сярод салістаў заняла студэнтка-першакурсніца з механіка-матэматычнага факультэта Н. Заіка.

**Л. КАМАІШКА,**
**студэнтка філфака.**

## ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

**Завяршыўся тыдзень СБА ў горадзе Мінску. У ім прыняў удзел і адзін з лепшых СБА нашага універсітэта — «Волаты» механіка-матэматычнага факультэта. Найбольш удала выступіў атрад у ігравых відах спорту. Па баскетболу ён заняў I месца і атрымаў кубак. Праводзіліся таксама спаборніцтвы па бегу, кіданню гранат, падыманню цяжару, перацягванню каната, валейболу, футболу.**

**НА ЗДЫМКАХ: імгненні спартакіяды СБА.** Фота **В. Шачака.**







## Адказнасць абавязвае

ПАСЛЯ шумных вуліц вялікага горада Ждановічы паказаліся ціхай зялёнай прыстанню. Калі аўтобус спыніўся ля рэспубліканскага інтэрната персанальных пенсіянераў, хваляваліся ўсе байцы СБА «Полымя», нядаўна створанага на юрыдычным факультэце. Мы ўпершыню ехалі да людзей, з імёнамі і справамі якіх звязаны слаўны шлях нашай Радзімы. Але хваляванні прайшлі самі сабой пасля надзвычай цёплай і душэўнай сустрэчы.

Мы пабывалі ў музеі ветэранаў партыі. Сам па сабе гэты музей унікальны. Тут сабраны матэрыялы аб жыццёвым шляху людзей, чый стаж знаходжання ў радах Камуністычнай партыі роўны 50 і больш гадоў. У кнізе водгукаў музея мы бачылі запісы, пакінутыя рабочымі, калгаснікамі, піянерамі, дэлегацыямі прадстаўнікоў розных рэспублік нашай неабсяжнай Радзімы, а таксама наведвальнікамі з Канады, Японіі, Францыі і іншых краін свету. Мы ганарымся тым, што змаглі пакінуць і свае водгукі аб музеі, якім кіруе А. К. Талкачоў, і словы ўдзячнасці пенсіянерцы Н. А. Усавай, якая падзялілася з намі ўспамінамі аб сустрэчах з У. І. Леніным.

Вярталіся вечарам. Нашы шумныя і гаваркія дзяўчаты раптам прымоўклі. Але словы не былі патрэбны, таму што думалі мы ўсе аб адным і тым жа — аб тых простых і па-сапраўднаму прыгожых асаблівай чалавечай прыгажосцю людзях, аб тым многім, што зрабілі і робяць яны для сённяшняга пакалення, аб вялікай адказнасці за працяг іх спраў і традыцый, якая ляжыць на нас і якую мы пастараемся апраўдаць.

**С. КАРАБЦОВА,**
**камісар СБА «Полымя».**

## Дружба гартуецца ў працы

**АБМЕН студэнцкімі будаўнічымі атрадамі — адна з форм супрацоўніцтва ВЛКСМ і брацкіх маладзёжных арганізацый сацыялістычных краін.**

**Вось ужо некалькі гадоў у час трэцяга працоўнага семестра на будоўлях Беларусі разам са студэнтамі БДУ імя У. І. Леніна працуе атрад студэнтаў Йенскага універсітэта ГДР. У гэтым годзе заключаны дагавор аб абмене студэнцкімі будаўнічымі атрадамі з Ямбольскім педагагічным інстытутам Народнай Рэспублікі Балгарыі. Прымаць балгарскі будаўнічы атрад даручана камуністычнаму СБА гістарычнага факультэта, які змагаецца за прысваенне імя Георгія Дзімітрава — вядомага дзеяча міжнароднага камуністычнага руху, 100-годдзе з дня нараджэння якога спаўняецца ў гэтым годзе.**

**Нашаму атраду выпала ганаровая і цяжкая задача—абсталяванне студэнцкага лагера, арганізацыя работы і адпачынку інтэратрада. Байцы атрада — 11 юнакоў і 8 дзяўчат, студэнтаў гістарычнага факультэта, настойліва рыхтуюцца да працоўнага семестра.**

**В. ШАДУРСКІ,**
**камандзір атрада.**

## Перамога была заслужанай

БУДАТРАД «Верасок» для многіх цяперашніх і былых студэнтаў філфака стаў школай жыцця, многія з нас аддалі яму часцінку сваёй душы. Гісторыя атрада пачалася 10 гадоў назад (у гэтым годзе ў «Вераска» юбілей). Першыя саставы яго былі чыста мужчынскімі. Але і зараз, хаця ў атрад уваходзяць у асноўным дзяўчаты, ён ні ў чым не ўступае мужчынскім атрадам. У мінулым годзе наш «Верасок» добра папрацаваў на браслаўскіх палях роднай Беларусі і заняў 1-е месца ў сваёй зоне. У цяперашнім годзе ў нас памянялася месца дыслакацыі.

Малдавія. Новае месца, новыя людзі... Атрад колькасна ўзрос — цяпер у яго ўваходзяць 50 байцоў. Не пакінулі свой «Верасок» і ветэраны. За падрыхтоўчы перыяд байцы атрада пасябравалі, працуюць з агеньчыкам і, галоўнае, з жаданнем. Наша агітбрыгада пад кіраўніцтвам Алены Ляпшкевіч старанна рыхтавалася да агляду-конкурсу факультэцкіх агітбрыгад, дзе заняла 2-е месца. Члены ваенна-патрыятычнай групы, якую ўзначальвае Жанна Абмётка, пачалі перапіску з бацькамі Надзеі Курчанкі, ганаровага байца атрада, са школай, дзе яна вучылася, і з Сухумскім аэрапортам, дзе працавала. Ужо атрыманы аб ёй цікавыя матэрыялы.

У Вязынцы на VI злёце філалагаў «Верасок» заняў 1-е месца сярод факультэцкіх атрадаў. Нашы байцы вызначыліся і ў афармленні палаткі, і ў конкурсе насценных газет, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа, і ў конкурсе на лепшую кампазіцыю з кветак, і ў конкурсе нацыянальных строў.

Перамога «Вераска» была заслужанай і таму вельмі прыемнай. І хочацца верыць, што наш атрад захавае свае традыцыі і на працягу працоўнага семестра.

**Т. ШУКЕЛОІЦЬ.**
**камісар СБА «Верасок».**

# КАЛІ ХОЧАШ БЫЦЬ ЗДАРОВЫМ...

**ФІЗКУЛЬТ-УРА!**

ЭКЗАМЕНЫ, экзамены — гарачая пара. Яна і на самай справе гарачая — гэтая пара, калі патрэбна сабраць у кулак усю сваю волю. Здаецца, што і гадзін у сутках менш, чым звычайна. Не хапае, як заўсёды, усяго аднаго дня, аднаго вечара, а то і адной гадзіны, каб змог рашуча сабе сказаць: «Усё. Да здачы экзамена я гатоў».

Даўно ўжо патухла святло ў жылых дамах, а ў студэнцкіх інтэрнатах да глыбокай ночы гараць лямпы. Маладыя людзі, схіліўшыся над пісьмовымі сталамі са стосамі падручнікаў і канспектаў, грызуць граніт навукі, забываючы аб адпачынку, ежы...

А пасля сесіі, калі наступае пара адпачынку, калі можна выйсці на вуліцу і на поўныя грудзі ўдыхнуць свежае паветра, пабываць удосталь на пляжы, схадзіць у кіно, тэатр, — нечакана прыходзіць недамаганне, санлівасць, галаўная боль, і настрой зусім не той, як у чалавека, атрымаўшага доўгачаканы адпачынак.

А магло б быць па-іншаму, калі б студэнт у экзаменацыйную пару арганізаваў сваю працу правільна і разумна, паклікаў бы на дапамогу фізічную культуру і спорт. Як гаворыць прымаўка: «У здаровым целе — здаровы дух». Сіла руху — гэта вялікая сіла, і яна ва ўсе часы была надзейным памочнікам і сябрам чалавека, якой бы працай ён ні займаўся.

Адкладзі на хвіліну канспект убок, студэнт! І паслухай тых, для каго заняткі фізічнай культурай і спортам трывала спалучаюцца з падрыхтоўкай да экзаменаў.

Мне не давялося доўга шукаць гэтых студэнтаў. Дастаткова было толькі прыйсці на наш універсітэцкі стадыён. Тут, дзесьці каля дзевяці гадзін вечара, збіраецца шмат маладых людзей. Стадыён у гэты час падобны на мурашнік. Усе ў руху, усе заняты сваёй справай. Футбольнае поле цалкам пад уладай студэнтаў-футбалістаў, валейбольныя і баскетбольныя пляцоўкі таксама выкарыстоўваюцца па назначэнню. Бадай, гэта галоўныя віды спорту тут, на стадыёне.

Знаёмлюся:

— Міхаіл Гундзіловіч, другі курс фізфака,— адказвае мне студэнт.

Міхаіл толькі закончыў гуляць у баскетбол і цяпер збіраецца ў інтэрнат.

— Адчуваю сябе добра, — працягвае ён далей.— Пагуляў у баскетбол, і стомленасці ад заняткаў над кнігамі як і не было. Сюды стараюся прыходзіць кожны дзень, чаргую падрыхтоўку да экзаменаў з адпачынкам на свежым паветры.

Падыходжу да футбольнага поля разам з М. Гудзіловічам. Ён знаёміць мяне са сваім сябрам.

— Сёння ў нас тут цэлы пакой,— крыху аддыхаўшыся, пачаў гаварыць другакурснік фізфака Ігар Пашкоўскі. — Разам займаемся спортам, а потым і за вучобу прымемся.

Студэнта мехмата Сяргея Каўтура я затрымаў на беговой дарожцы.

— Якія вынікі маіх заняткаў фізкультурай і спортам? —перапытвае Сяргей.— Галоўнае тое, што цяпер перад сесіяй у мяне добрае самаадчуванне, і рыхтавацца да экзаменаў я магу без усякіх цяжкасцей.

Сяргей далей працягвае сваю гаворку. І я даведваюся, што прыходзіць ён на стадыён як вечарам, так і раніцою. Увесь дзень у яго заняты актыўнай працай і адпачынкам.

Гутарку са студэнтамі, якія ўмацоўваюць сваё здароўе на стадыёне, я заканчваю. Кожны студэнт можа (і павінен) прыйсці сюды, адклаўшы свой канспект убок, каб потым здаровым, са свежымі думкамі ўзяцца за вучобу.

**І. ПАПКО,**
**наш спец. кар.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

27 мая 1982 г.

АТ 21300 Заказ 1044.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ